БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

[А]дрэс радакцыі і адміністрацыі:
[Ка]рпухоуская вул. д. № 12

[Рэд]акцыя адчынена ад 1 до 2 гадз. пасьля поудня.
[Адм]іністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

[Рэд]акцыя пакідае за сабой права па[пра]уляць нарысыланые рукапісы і корэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 к.

Падпіска: з дастаукай да дому у Міэску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак: за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб. на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 78. Менск. Субота 29 чэрвеня 1918 г. Год I

[Ч]арод[н]ы № «Беларускаго [Шл]яху» выйдзе у аутарак, 2 [ліп]ня.

Менск 29/VI.

Матэрьял для Дзержавы.

[Д]зержава законамі рэгуліру[е ад]носіны людзей паміж са[бой], абавязкі людзей да вы[шэ]йшай уласьці, прыводзіць [у]сь механізм жыцця і усе [орг]аны дзержавы у стройную [сі]стэму.

У нас у Беларускай Рэчы[па]сполітай, каторай тэрыторыя [яш]чэ ішчэ арэнай палітычных [і] ваенных недакончэнасцей, [ств]аранне формовання дзержау[на]сьці вымагаець вялікіх вы[сіл]коу.

[Д]арога каторай ідзець Рада [до]ўга і цяжкая, але прахадзі[ма]я. За намі стаіць наш спа[кой]ны працавіты і церпеливы [бел]арускі народ. Гістарычная [яг]о доля вывучыла найбольш [ба]ранцца на самаго сябе. Бе[лар]ус усе аналізіруець і усе [пера]рае ацэнікаець, а нісправ[а]пасьць ад яго ні хаваецца. Наш край за вайну столькі [пера]йшоу сабыцій, столькі ві[дзе]у нацый, столькі наслухаў[ся] ад мітынгуюшчэй арміі со[цы]яльных і палітычных тэо[ры]й, як ніякі народ у Расіі, [бо] тут густа стаяла армія.

Але скэптытызм беларуса [ас]тавау яго ад анархіі, і ця[пе]р веска такая самая тра[ды]цыонная і консэрватыупая як была. І Беларусь цяпер на [ві]цэсам самы спакоуны край [б]ыушэй Імпэрыі.

Гэта край з вялікім клясам [др]обнай творчэй сельскай і [м]естэчковай буржуазіі, край [ус]тойчывы.

Праца Беларускай Рады.

Гіпэртрофія бюджэта земств [і] гарадоу даводзіць, што наез[джы]я «земгусары», выбранныя [ка]міей у комаунальныя аргані[за]цыі, ні мелі рэяльнаго па[ня]цця аб эканамічным пала[жэ]нню края. Наладжываць [зве]рху мэдыцыну і школу гэта [ліш]ча мала. Дзе ні было зем[ст]ва, як у Віленшчыне там [ме]стэчкі і уласьці падтрыма[лі] субсідыіей прыватных дак-тароу. Самопомашч обывателей можэць пашырыць мэдыцынскую помач і гэта будзе рацыянальней і таннэй. Наагул, насажыванне зверху усякай цывілізацыі, ніпрыспасобленай да эканамічнаго і жыццеваго укладу народу будзе тратай грошы.

Беларуская Рада хочэ пры помачы усіх людзей, каторыя знаюць Беларусь і дбаюць аб яе дабро вырабіць тэзісы устройства края, найбольш падхадзячаго да яго варункоу і традзіцый бяручы і з Захада тое, што вырабіла там культура больш высокая. Фінансы, коммунальныя інстытуцыі, зямельная справа, індустрыя, гандэль, школы, увівэрсітэт, конституцыя Беларусі, міжнародныя проблемы і нацыянальныя, усе гэта будзе той творчай працай, каторай увесь край чэкаець ад цэнтральнаго нацыянальнаго органу.

А. У.

Агульныя весткі.

БЭРН, 25/VI. Згодна газ. «Морнінгпост» з Дубліна, у Ірляндзіі за апошні час вельмі часто бываюць выпадкі узбурэння і ніслуханне проціу ангельскіх уласьцей. У Трам застрэляны два паліцэйскіх сярод белаго дня. У Балігары справа дайшла, с прычын арэшту дзеля нідазволеннаго ваеннаго абучэння, да праўдзівай вулічнай стычкі паміж паліцыяй і насяленням. У Дубліне і другіх мейсцах, ні глядзючы на строгую забарону, ваенныя заняцці ідуць далей. 23 арэштаваных дзеля гэтаго мужчын адмовіліся на судзе казаць сваю фімілію. З Баллімоса ўцёк на велосіпэдзі адзін сін-фэйнэр, проціу якога быу выдан прыказ арэшту дзеля таго, што ён выстрэліу у жандарма спаткаушагося яму. «Дэйлі-Кронікль» пацьверджае, што пануючая у Ірляндзіі анархія ёсьць вынікам безпрыкладнаго пужання сінфэйнерамі.

ДУБЛІН, 24/VI. Паліцыя канфіскавала 40,000 стрэльбавых патронаў, якія меліся пераправіць пад відам хлеба у мешках у Ірляндзію.

БЭРН, 25/VI. У нідаўна павядомленай прамове Маура аб гішпанскіх вымаганнях, судзючы па апублікаванаму цяпер паведамленню, гаворыцца аб Гібралтары: «Гішпанія, дзеля таго, каб заняць сваё мейсцо у праліве Гібралтара, павінна паказаць гэту гатоўнасьць і выпоўніць свой доўг.

БЭРЛІН, 25/VI. Сягоння у ведомстве міжнародных спраў зробіцца абмен ратыфіцыраваных дакумэнтаў, па поваду заключэнай 27-го Марца між Гэрманіяй і Фінляндзіяй мірнай умовы а так сама згоды аб таргоўлі і судаходстві.

ПЕЦЯРБУГ, 25/VI. Фінляндзкія войскі пачынаюць надыходзіць да Мурманскаго ўзбярэжжа. Як паведамляюць расійскія газэты, жалезна-дарожная станцыя Кэмай знаходзіцца ужо у руках фінляндцаў.

ЖЭНЭВА, 24/VI. Клемансо прэбывау у суботу у главнай стауцы амэрыканскіх ваенных сіл. Агледжаны ім район, згодна французкім газэтам, зрабіу па Клемансо вельмі добрае уражэнне. Апрача таго там была важная нарада, у якой прынімалі учасьце так-сама Тардзіе, Першынг і Фош, і на якой абгаварывалася французка-амэрыканская дзеяльнасьць у будучых ваенных апэрацыях. Ва усіх пунктах нібы то дайшлі да поўнай згоды.

ГААГА, 24/VI. З апублікаванаго прыгавора Гаагскаго суда, па якому нейкі І. М. Лімбург караецца 3 гадамі турмы за дзяржаўнае здрайство, высьвяецца, што абвінавачаны даставіў ваеннаму атташэ французкаго пасольства з архіваў 1-ай дывізіі палевой арміі дакумэнты, тычачыя арганізацыі арміі.

АМСТЭРДАМ, 24/VI. Абедзьве бомбы, каторыя былі скінуты самалётамі на Голляндскую тэрыторыю каля Аардэнбурга, пры чым ранен быу адзін хлопчык, па паведамленню «Тэлеграфа» з Флісінгена—ангельскай выробкі.

РОТТЭРДАМ, 24/VI. Паводлуг Вашынгтонскіх вестак, дзержавы згоды усё болей стараюцца мець свой уплыў на амэрыканскі урад і прымусіць яго падтрымліваць сыбірскія справы. «Манчэстэр Гардіан» паведамляе, што Вільсон нібы-то згодзіўся на японскае умешацельство у Сыбіры.

ЯПОНІЯ. Апошнія падрахункі японскіх банкаў—піша месячнік «Банкірэ Магазін» за месяц чэрвень 1918 г.—ёсьць пацьвярджэннем таго, што іх справы вельмі добра стаяць. Значнае павялічэнне дэпазытаў ёсьць самае звычайнае зьявішчо і рука у руку, аднак, павялічываецца і акцыянэрны капітал. Так напрыклад у працяг 1917 г. дэпозыты банка Іокагама Спецie ад 275 мільёнаў павысіліся да 527 мільёнаў; адначасна капітал павысіўся ад 30 на на 34 міл. і ен. Ішчэ мацней узрос капітал японскаго прамысловаго банка, каторы амаль удубэльтаваўся. Дэпозыты падняліся ад $35^1/_2$ да 50 мільёнаў, капітал ад $17^1/_2$ да 40 мільёнаў, з якіх, аднак, 9.495,509 іен ішчэ ні ўнесены.

Беларускі народны унівэрсытэт у Маскве.

Культурна-прасьветным аддзелам Б. Нац. Каміссарыяту у Маскве разсылаюцца на усім культурна прасьв. і настаўніцкім арганізацыям просьбы апавесьціць аб адчыненым на лето 1918 г. у Маскве беларуск. народным унівэрсытэці і прысланць двух сваіх членаў на слуханне лекцыяў.

Летні сэмэстр працягнецца ад 1 ліпня да 1 верэсня (2 месяцы).

Будуць чытацца лекцыі па пытанням: 1) Беларусазнаўства [мова і літэратура, гісторыя этнографія і географія, народная гаспадарка, нацыянальна-рэвал. рух і г. і.]; 2) Соцыяльна-палітычным [гасударство і яго кшталты, гісторыя народнай гаспадаркі, аграрнае пытанне, рабочае пытанне, нацыянальнае пытанне, гісторыя рэвалюц. руху на Заходзе і у Расіі, гісторыя соцыялізму.]; 3) Агульна-пэдагогічным [гісторыя прасьветы на Заходзе і у Расіі, зашкольная прасьвета, дашкольнае выхаванне, працоўная школа і г. і.]; 4) Прыродазнаўств [філозофія прыродазнаўства, засады астрономіі, геологіі, біологіі і г. і.].

У студэнты прымаюцца настаўнікі і настаўніцы нізшых і сярэдніх школаў на Беларусі, прэдстаўнікі ад прасьв. аддзелаў радаў раб. і сел. дэпутатаў на Беларусі, члены беларускіх культурна-прасьветных арганізацыяў і усе цікавячыеся беларускай народнасьцю і культурай.

Вучэнне будзе ісьці што дзенна у вечары, ні меней 4 гадзін у дзень. Слуханне лекцыяў безплатнае. Для прыездных [настаўнікоў і настаўніц і дэлегатаў нацыянальных і культурна-нацыял. арганізацыяў будзе дадзено дармовае памешканне (на 100 асоб] а бяднейшым, маючым адпаведныя пасьвядчэнні матэр'яльнае падтрыманне і вернуты кошты на праезд.

Запісывацца можна па почце, па тэлеграфу і яўляючыся лічна на Поварскую 52 у Культурна-Прасьветны аддзел.

Вітаючы паўстанне такой інстытуцыі, мы аднак моцна сумляваемся у тым, ці знойдуцца адпаведныя лектары—у Маскве—для такой шырокай праграмы. Другое, нам здаецца што Масква цяпер саўсім ні адпаведнае мейсцо для навукі. Наўрад большэвікі дадуць спакойна займацца тамака навукаю і зрабіўшы націск на нашых «нацыянальных комісарау» ні уціснуць туды свайй раз'едаючай палітыкі.

ФЭЛЬЕТОН.

НІУМЕЛЫЯ ЧАРАУНІКІ.

«З нас сьмяюцца, нас вінаваціць, што мы нічога ні умеем рабіць. Паказуюць на нашыя хібы і кажуць што мы нікога ні пушчаем да работы. А чаму-ж яны, тыя умекі, гэтыя кемныя і здольныя людзі, гэтыя саботажнікі, гэтыя...»— казаў падобны да азнача, ка-

місар арміі і флоту Дыбенко на мітынгу у Петраградзе, у казармах ізмайлоўцаў—«чаму яны ні ідуць да нас і ні працуюць чаму замест гэтаго, яны гэтыя...» казаў далей Дыбенко, усё болей распаляючыся і выкідаючы з распалёных вуснаў што раз то горшыя лаянкі на усю расійскую інтэлігэнцыю.

Шэрыя шынэлі мітынгуючаго маскальства і куцыя, блінападобныя кепі усьцяж бастуючых для дабра соцыялізму работнікаў, пакрывалі гэтую Дыбенкову лаянку сваім здаволеным гулам і вопляскамі. Атмосфэра нагрэвалася, распалены Дыбенко мягкімі тыгрысовымі крокамі кідаўся на эстрадзе і кідаў адтуль у туман разагрэтай ненавісьцю «пролетарскай сьвядомасьці» шалёныя рыкі.

— «Рэзаць... Выпусьцім жываты!...»

Было гэто у самым пачатку лютаго. Большэвікі шмат гаварылі аб патрэбі стварэння чырвонай арміі і мітынг, на якім прамаўляў Дыбенко — быў вербовачны мітынг.

За Дыбенкам прамаўляў другі большэвік—Валадарскі. Асьцярожныя крокі па шырокай эстрадзе... Плаўная легкая гутарка... Спранжыновая хвігура і, маўляў, дабра рэгуляваная спранжыновая жэстыкуляцыя... Усе задаткі уталентаванаго натураю красоўцы...

І павядзэнне ішчэ большае, чым у Дыбенкі...

Аднак мне, папаўшаму па гэты мітынг прыпадкова, каб пабачыць «знаменітасьцяў» большэвізму, ні ішла вера у гэтае павядзэнне. Успаміналіся словы аднаго інтэлігэнтнаго чалавека, старасты аднэй з воласьцяў Шліссэльбургскаго павету аб мітынгах 1905 году: «ведаеце, хадзілі глядзець, як на выставу у цырк: хто каго «паложыць на абедзьве лапаткі» — была разрыўка». Глядзючы на гэты гультайскі натоўп, каторы слухаў кідаўшых па эстрадзі большэвікоў, так і думалося, што ні ў якую армію гэтыя людзі ні пойдуць, а пойдуць пасьля у кінематограф і с такім-жа задаваленнем будуць тамака рагатаць над камічнымі сцэнамі, падказуючы брыдкія рэплікі і грызучы семячкі...

І... нібы рабілося шкода большэвікоў...

Ні іх ідэі, ні іх замеркаванняў. Але па чалавеччаму шкода было людзей: гэтаго—барадатаго надволжанскаго кручніка, катораго жартаўлівая доля вынесла на самы верх рэволюцыйнай хвалі даўшы яму ні выконання, але вялікія для яго вузкай мазгавенькі абавязкі ваенна-марскога камісара, гэтаго сьляпого падземнаго крота катораго асьляціло і зьбіло с панталыку сьвятло, — Валадарскаго, гэтаго сярэдніковаго, у вялізных круглых, сініх акулярах (чамусь ён мне здаецца такім) альхіміка—Леніна, лабараторнаго творца новаго чалавечаства, творца гомункулюсаў соцыялізму і падобных ім.

Бачным было іх безсілле. І здавалося што ні толькі настароннаму воку гэта было відно але і самі яны зьнівэрыліся у тым чудзішчу «обло, огромно, стозѣвно», якоя выклікалі да жыцця і для якого забілі ў ахвяру інтэлігэнцыю.

Здавалося, уразумелі, што без яе нічого ні зробіш, але ні могучы нічога направіць, кідаліся па эстрадзе расійскаго жыцця, шпургаючы у вапанаваўшы у ім безпрасьветны туман, без мэты злосныя, шалёныя і толькі дзеля імпэту скіраваныя проціў інтэлігэнцыі выкрыкі:

«Рэзаць... Выпусьціць жывот».

Па чалавецтву рабілося шкода гэтых загнаных у псыхічны куток людзей...

—І.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкага вярхоўн[ага] камандавання за 27 чэрвеня 1918 року.

Захадні тэатр вайны.

Група арм. Кронпрынца Рупрэхта і Гэрманскаго Кронпрын[ца]

Становішчо без перамен. Напружаная варожая дзея[ль]насьць паўночней Скарпы і Соммы, захадней Суассона паўднева-захадней Рэймса. На Рэймскім саборы зноў в[ы]рылі варожых дазорных. Артылерыйская дзеяльнасьць зьвязі з боямі пяхотных разведчыкаў у ночы усілілася усім астатнім фронці паміж Ізэрам і Марнай.

Група арміяў Гальвіца.

На усходнім беразі рэкі Ваос мы зрабілі усьпеш[ныя] разведкі. Паўночней Сэнт-Мігіэль быў адбіты сільны варо[жы] націск.

3 варожых атрадаў у паветры, якія за апошнія дні рабілі налеты на Карлсруэ, Оффэнбург і Летарын[гскі] прамысловы район, зьбіто 5 самалетаў.

Нашы уваздушныя эскадрыллі скінулі учора бомбы Парыж, а на дарозі туды, на вузлавую жалезна-дарож[ную] станцыю і на варожыя аэродромы.

Лейтэнант Руней меў сваю 25-ю перамогу у паветр[ы].

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

У Земстві. Губэрнскае земскае сабранне ні знайшло маральнай мажлівасьці працаваць па апецы падкідышаў разам с таварыствам «Милосердіе».

Зьвязаная гэтай пастановай губэрнскаго сабрання управа ні можа субсідаваць таварыство «Милосердіе».

Дзеля гэтаго губэрнская управа увайшла у перэгаворы з другім менскім добрадзейным таварыствам аб уладжэнні прытулку для падкідышаў пры падмозі капіталаў гэтаго таварыства і у памешканнях належачых яму, але покуль што з гэтых перэгавораў нічога ні выйшло.

Што тычыцца пытання аб уладжэнні уласнаго прытулку, то губэрнская управа пакуль зрабіць яго ні можа, дзеля крытычнаго фінансавога становішча у земстві.

У меськай управе. Зьменьшэнне штатаў меськай управы, перапоўненай супрацоўнікамі у часе большэвізма і без асобай у гэтым патрэбы, у відочную німагату збяднеўшай кассе, унасьледаваўшай старадумскаго даўга $1^1/_2$ мільена рублеў (а усяго з даўгамі апошняго часу да 6-ці мільенаў), можна даць меськаму самаўпраўленню салідную цыфру з эканомаваных грошай—каля $3^1/_2$ мільенаў руб. у год.

Гэта рэзультат ад урэзкі дорага каштуючых штатаў, паводлуг мнення аднаго з відных дзеячоў меськай управы, напэўна, будзе дасьцігнуты, дзеля таго што і на далей рэшано ісьці на кірунку спынення нікчэмных пасад—«заведывающых» і «падзаведывающых» аддзеламі амбулаторных фэльдшароў, ізоляцыйнай і вэнэрычнай камэр і інш.

Нельга ні пажадаць, каб быўшая безгаспадарнасьць і ніутрыманы фінансовы размах прымусілі цяперашнюю управу палажыць руку і на такія аддзелы, як страіцельны, дзе сьмета зьменьшана, пры усім ніжаданні, на 300,000 руб., а раўным чынам і на аддзел народнай прасьветы, [д]зьменьшэнне даходзіць 379,0[..] руб.

Мэдыка-санітарны савет п[ры] меськай управе есьць орг[ан] давераных, ведаючы, па пр[а]экту, усе адраслі меськ[ай] мэдыцыны, санітарнай і апт[эч]най справы, злучаючай і [кіру]руючый іх работу. У круг я[го] ведзення уходзяць: 1) абсу[ж]жэнне усіх прынцыпіяльн[ых] пытанняў, мэдыцыны, саніт[а]рыі і ветэрынарыі, 2) арга[ні]зацыя шырокай санітарн[а]-прасьветнай дзеяльнасьці с[я]род насялення, 3) агульн[ы] дагляд за дзеяльнасьцю мэд[ы]цынскіх установаў места і ін[ш].

Бабруйскае надзвычайнае зе[мскае] сабранне, быўшае 13-14 чэр[]веня, прыняло становішчо а[б] паветовым камітэці па наро[д]най асьвеце, каторы будз[е] складацца с прэдстаўнікоў зе[м]скіх і местовых самаўпраўле[н]няў, дэлегатаў вучыцельскаг[а] хаўруса, паветоваго агранома санітарнаго лекара і прэдстаў[]нікоў культурна-прасьветных таварыств.

Да беларускага пытання. На прыем 24 чэрвеня глаўнакамандуючым X арміі генэралам фон-Фанкельгайнам меськаго галавы Хржонстоўскаго і усіх пяці членаў управы адным з апошніх было паміж іншым закранута пытанне аб нацыянальным самаазначэнню беларускаго краю, у зьвязі с коньюнктурай апошняго часу у гэтай сфэры.

На гэта глаўнакамандуючы адпаведаў, што пытанне аб самаазначэнні разрэшыцца у хуткім часе у спагадным кірунку для змучаных вайною народнасьцяў краю.

А пакуль павінны быць дададзены усе старанні,—закончыў генэрал фон-Фанкельгайн, к смягчэнню мерапрыяццяў нямецкіх уласьцей, выкліканых варункамі ваеннаго часу і ніхай насяленне ні сумлеваецца у нашых прыязьненых да яго адносінах.

Прыем насіў спагадны і сэрдэчны характар.

Сягоння 29 чэрвеня н. ст., дзеля сьвята Петра і Паула, католікі, служачыя меськай рады і губэрнскаго земства уволены ад заняцця.

На рэках Вавілону.

«Успамінаючы аб гэтым,
Праліваю я душу маю.»
(Эха-Раза)

VI*).

Жыццевай сілы падалі зноў «Пралесцэ» вярнуўшыеся з вакацыяў у Казань вучні В і л е н с к а й школы, каторыя уступіўшы у арганізацыю пачалі гуртаваць каля яе наперш моладзь і бачна прыглядаючыся да усяго беларускаго руху паведамлялі аб ім усіх уцекачоў. Іх усілкі рабіліся каб пакіраваць палітычную мысьль уцекачоў у бок уразумення і прызнання ніабходнасьці беларускай дзержаўнай ніевалежнасьці. Венчаў гэтую шчырую працу той наказ дэлегатам на першы беларускі з'езд у Маскве, першым пунктам якога было: н і з а л е ж н а с ь ц ь Б е л а р у с і.

Ні абыйшлося пры гэтым і без перашкод, якія рабіліся ужо ні чужымі, але сваймі людзьмі, рэнэгатамі Беларусшчыны. Сярод іх асабліва адзначыліся Шайновіч з Гродзеншчыны і праваслаўны сьвяшчэннік Тэодоровіч.

Дзякуючы культурна-прасьветнай працы «Пралескі» нацыянальная сьвядомасьць сярод уцекачоў расла с кожным днем. Нарастала патрэба у нацыянальна-палітычнай арганізацыі, якая павінна была адкрыта змагацца за нізалежнасьць Беларусі. Але для стварэння такой арганізацыі у маладых працаўнікоў «Пралескі» ні ставало адвагі. І вось у гэты пераломны час яны знайшлі падтрыманне хаця і ні доўга ад служачых Менскаго аддзялення расійскагб дзержаўнаго банку. За іх пачынам 10/xi 1917 году у Некрасаўскай бібліотэцэ быў склікапы агульны сход усіх беларусаў с тэй ці іншай прычыны папаўшых на жыцце у Казань. Для асьведамлення аб мэці сходу былі адбіты на шапірографе адозвы і апавешчэння, у якіх гаварылося, што сход склікаецца дзеля стварэння нацыянальна-палітычнай арганізацыі.

Перад назначанай гадзінай досыць уместная заля Некрасаўскай бібліатэкі перапоўнілася народам. Ні гледзя на перапаўненне у залі панаваў найлепшы парадак. Відаць было што людзі адчуваюць урочыстасьць хвілі. Прабіла у канцы і назначаная гадзіна. Адкрыты прамоваю аднаго з арганізатараў, сход афіцыяльна пачаўся. Працазыцыя адчыніць у Казані аддзел Беларускай Рады шчыра віталася і была прынята аднагалосна. Пастанова аб патрэбі стварэння беларускаго войска была прынята воплескамі і выклікала у учасьнікаў сходу жаданне злажыць і свае ахвяры на карысць Ц. Вайск. Рады у Менску. Вялікая Рада у Менску прызнавалася ядыным правамоцным кіраўнічым нацыянальным органом. Быў выбраны урад паўстаўшэй ад гэтаго сходу Беларускай Казанскай Рады.

VII.

Аднак ніхват людзей здольных да сьвядомай нацыянальна-палітычнай працы тамаваў чыннасьць Казанскай Рады і зрабіў яе меней карыстнай, чым гэто было трэба у той час. Бежанская масса, якая складалася з селянства і дробнаго і сярэдняго чыноўніцтва, мала сьвядомаго нацыянальна і нідасьвядчонаго палітычна, ні магла выдзеліць такіх людзей. Выбраны загадчыкам спраў Рады гр. Жукоўскі ні аказаўся адпаведным свайму становішчу. Разам с тым усілкам шчырых працаўнікоў і добрых беларусаў як. гр. гр. Кананові́ч, Арлоўскі, Шакул, Лабука і інш. ніудавалося перамагчы таго індэфэрэнтызму, які панаваў сярод уцекачоў і выклікаць іх да самадзейнай працы. Усё-ж такі ідэя нівалежнай, дзержаўнай, Беларусі шырылася нікаторымі сябрамі Рады і імі-ж рабілася культурная работа: чыталіся лекцыі і інш.

Але канец і гэтай рабоце палажыў разгон большэвікамі агульна-беларускаго зьезду у Менску. Ішчэ да гэтаго праўда Казанская Рада цярпела ні мала ад большэвікоў і асабліва ад нападак большэвіцкаго правадыра у Казані Грасіса, каторы нацкоўваў на яе цемныя сілы. Натуральна, што у той час, як Менскі большэвіцкі «совнарком» так «рашуча», паступіў са зьездам, рэпрэзэнтаваўшым у с ю Беларусь, Казанская Рада, якая прэдстаўляла нівялічкую (у пароўнанні) группу беларусаў павінна была перастаць істнаваць. Так і зрабілося. Рада была зачынена, але беларуская нацыянальная праца ішла далей, сваім торам.

В. Грыневіч.

(Далей будзе).

*) Гл. № 73 і 75.

Рэдактар **А. Прушынскі.**
Выдавецтва **«Т-во Заранка.»**

Друкарня Я. А. Грынблята.